1. *Маркова, Ю. В.* Аудиовизуальные технологии как неотъемлемое средство формирования общекультурных компетенций у студентов вышей школы [Электронный ресурс] / Ю. В. Маркова // Молодой ученый. – 2015. – № 3. – С. 805–808. – Режим доступа: https://moluch.ru/archive/ 83/15125. – Дата доступа: 12.01.2020.

2. Развитие двигательных навыков аккордеониста (с использованием мультимедийных технологий) [Электронный ресурс] : учеб.-метод. пособие / В. П. Бубен, В. Г. Федорук. – 2-е изд. – Минск : БГПУ, 2012. – 88 с. – 1 электрон. опт. диск (CD-ROM).

3. *Слепенькин, А. Е.* Современные аудиовизуальные и информационные технологии в образовании [Электронный ресурс] / А. Е. Слепенькин // Актуальные вопросы современной педагогики : материалы Междунар. науч. конф., Уфа, июнь 2011 г. – Уфа, 2011. – С. 132–134. – Режим доступа: https://moluch.ru/conf/ped/archive/18/778/. – Дата доступа: 07.01.2020.

**А. І. Сцепанцоў,**
*кандыдат культуралогіі, дацэнт,*
*прафессар кафедры культуралогіі*
*і псіхолага-педагагічных дысцыплін ІПКіПК*

# ДЗЕЙНАСЦЬ СЕЛЬСКІХ УСТАНОЎ КУЛЬТУРЫ ЯК ЗАХАВАЛЬНІКАЎ РЭГІЯНАЛЬНЫХ ФАЛЬКЛОРНЫХ ТРАДЫЦЫЙ У ЗМЕСЦЕ АДУКАЦЫЙНЫХ ПРАГРАМ ПА СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ ПЕРАПАДРЫХТОЎКІ «КУЛЬТУРНА-АДПАЧЫНКАВАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ»

Практыка выкарыстання фальклорных традыцый рэгіёну пры правядзенні мерапрыемстваў у сельскіх дамах культуры атрымала шырокае распаўсюджванне. Не застаюцца ў баку раённыя і гарадскія цэнтры культуры: актыўна ўжываюцца фальклорныя набыткі ў мясцовых адпачынкавых праграмах і праектах, што робіць непаўторны ўнёсак у агульную нацыянальную культуру Беларусі. Значны грамадскі рэзанас маюць міжрэгіянальныя, рэспубліканскія, міжнародныя фестывалі фальклору, якія праводзяцца ў краіне. Падзяляем тэзіс Г. С. Ціханоўскай пра тое, што народныя мастацкія традыцыі, якія існавалі як натуральная частка жыцця людзей у мінулыя стагоддзі, у наш час з’яўляюцца гісторыка-культурнай спад-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чынай, найкаштоўным архівам народнай культуры. Гэтыя традыцыі захоўваюцца ў апісаннях гісторыкаў-этнографаў, мастацтвазнаўцаў, літаратуразнаўцаў і іншых аматараў-збіральнікаў[1]. Дадамо, што менавіта практыка адмыслоўцаў (арганізатараў культурна-адпачынкавай дзейнасці) шмат у чым спрыяе рэпрадуктаванню розных формаў рэгіянальнага фальклору ў стылізаваным абрадава-гульнявым дзействе.

Дадзены напрамак традыцыйнай культуры знайшоў адлюстраванне ў адукацыйных праграмах перападрыхтоўкі па спецыяльнасці «культурна-адпачынкавая дзейнасць». Слухачы асвойваюць змест рытуальна-абрадавых комплексаў, сістэмы жанраў беларускага фальклору, асаблівасцей узаемаадносін абрадавай практыкі і абрадавай паэзіі. Падчас заняткаў яны набываюць уменне распрацоўваць структуру культурна-адпачынкавых праграм з апорай на этнакультурныя традыцыі беларускага народа, паглыбляюцца ў гісторыю фарміравання беларускага этнаса, у асабліваці развіцця матэрыяльнай і духоўнай культуры розных рэгіёнаў Беларусі[2].

Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў культуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» дае магчымасць паспяховым практыкам сферы культуры атрымаць кваліфікацыю «арганізатар культурна-адпачынкавай дзейнасці». На аснове практычных навыкаў і ўменняў саіскальнікі прафесійнай кваліфікацыі асвойваюць і паглыбляюць тэарэтычныя веды.

Найболей запатрабаванай формай заняткаў з'яўляецца «круглы стол», асновай якога служыць абмен досведам працы слухачоў ва ўстановах культуры. Зносіны слухачоў даюць магчымасць удасканальваць сваю практыку, павялічваць эфектыўнасць распрацовак творчых праектаў. Вывучаючы курс «Тэорыя культурна-адпачынкавай дзейнасці», які пабудаваны на абагульненні культурных практык, слухачы дапаўняюць яго сваімі творчымі праектамі.

Адным з прыкладаў такога вопыту можа быць практыка выкарыстання фальклорных традыцый рэгіёну пры правядзенні

---

[1] Тихоновская Г. С. Актуальные проблемы реализации народных традиций в деятельности учреждений культуры // Культура и образование: научно-информационный журнал вузов культуры и искусств. – 2017. – № 2 (25). – С. 77–84.

[2] Змест адукацыйных праграм перападрыхтоўкі выбудоўваецца на падставе дзеючага стандарта АСРБ 2-23 02 72-2016.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культурна-адпачынкавых мерапрыемстваў у сельскім доме культуры аграгарадка Прусы. Стрыжнем захоўвання мясцовых традыцый называюць фальклорны калектыў «Прусаўчанка» Старадарожскага раёна. Калектыў адзначыў у 2017 г. 45 гадоў творчай дзейнасці. Сваёй непаўторнай манерай выканання група вядомая за межамі краіны. У 2015 г. творчасць «Прусаўчанкі» разам з народным фальклорным калектывам «Набіліцы» атрымала статус гісторыка-культурнай каштоўнасці нематэрыяльнай праявы творчасці чалавека «Песенная традыцыя міжрэчча вярхоўяў Пцічы і Спаруй у в. Бараново і в. Прусы Старадарожскага раёна Менскай вобласці». Да свайго юбілею калектыў запісаў дыск. Сёння стыль выканання і рэпертуар «Прусаўчанкі» пераймаюць мясцовыя дзіцячыя вакальныя групы.

Фальклорны калектыў «Прусаўчанка» адраджае народную традыцыю вячорак. Усе артысты, якія ўдзельнічаюць у тэатральнай пастаноўцы, – мясцовыя жыхары. Традыцыя вячорак распаўсюджана ў Беларусі, цяпер і аграгарадок Прусы аднаўляе яе: гэты творчы праект пакажа адметнасць бытавання вячорак ў сваёй мясцовасці; раскрые багацце і каларыт беларускага фальклору (песні, прыпеўкі, танцы, загадкі, прыкметы); і, як зазначаюць усе зацікаўленыя, – будзе выхоўваць любоў і павагу да роднага слова, да нацыянальнай спадчыны.

У нядзелю 13 кастрычніка мінулага года Беларускае тэлебачанне ў праграме «Наперад у мінулае» паказала абрад «Вяселле», падрыхтаваны фальклорным народным калектывам «Прусаўчанка». Святочны настрой, спевы, танцы, жарты, прымаўкі панавалі ў студыі. Песні вельмі выразныя, яны з любоўю перададзены выканаўцамі ад дзедаў і прадзедаў з захаваннем мясцовага каларыту. Разам з дарослымі артыстамі ўдзельнічалі школьнікі старшых класаў. Усе яны наведваюць клубныя аматарскія аб’яднанні.

Праграмы і праекты, наладжаныя клубнымі работнікамі сельскага клуба аграгарадка Прусы, знаходзяць не толькі зацікаўленага гледача, але праходзяць з актыўным удзелам аднавяскоўцаў. Асабліва каштоўна і вельмі надзённа, што да ўдзелу ў фальклорных праграмах і праектах прыцягваецца школьная моладзь, бо менавіта праз іх магчыма перадаваць «гістарычную памяць», сувязь з роднай культурай, зберагаць традыцыі, не забываць іх у імклівым глабальным руху сусветнай цывілізацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Асабліва зацікаўлена адбываюцца абмеркаванні праектаў, звязаных з рэгіянальнымі культурнымі акцыямі.

Адзін з такіх фэстываляў традыцыйна праводзіцца ў Гомельскай вобласці і сваёй назвай «Кліч Палесся» – ўмоўна аб’ядноўвае гісторыка-культурную вобласць – Беларускае Палессе. Фэстываль у 2018 г. прайшоў у пяты раз у аграгарадку Ляскавічы Петрыкаўскага раёна. У фэстывалі ўдзельнічала больш за 1,7 тыс. артыстаў і каля 20 тыс. гледачоў. Праграму прадстаўлялі творчыя калектывы, майстры і рамеснікі з палескіх раёнаў Гомельскай і Брэсцкай абласцей. Амаль на 3 км удоўж Прыпяці разгарнуліся падворкі беларускіх вёсак з незвычайнымі назвамі, даўняй гісторыяй, традыцыямі, напрыклад: Хлябы, Дварэц, Бабраняты, Хлапцы, Серп… На адзін дзень яны аб’ядналіся ў Палесскі край пад лозунгам «У сваім краі, як у раі». Падворкі прапанавалі дэгустацыю традыцыйных страў па старадаўніх рэцэптах, праводзілі майстар-класы па аўтэнтычных дэкаратыўна-прыкладных вырабах. Гэта кавальская і ганчарная справа, разьба па дрэве і лозапляценне, выраб рэквізіту і лялек для батлейкі, ткацтва і «зялёная аптэка» («народныя лекі з прыроднай аптэкі»).

Вялікая цікавасць і жывы ўдзел наведвальнікаў свята былі выяўлены да майстар-класаў «Танчым па-даўнейшаму» па старадаўніх побытавых танцах, сярод якіх лявоніха, каробачка, падыспань. Прывабілі ўсіх і народныя гульні, забавы на прадстаўленні «Сярод вёскі карагод». Фэстываль адбыўся як грамадска-культурная, мастацкая акцыя. Як культурная падзея фэстываль шырока адзначаўся ў рэспубліканскай прэсе, на тэлебачанні, яго матэрыялы змесцаваны ў інтэрнэце, а значыць, змястоўная мастацкая інфармацыя стала даступная значнай аўдыторыі карыстальнікаў.

Слухачы-магіляўчане ўзгадалі Шосты этнафестываль «У госці да радзімічаў», які адбыўся ў аграгарадку Радомля Чавусскага раёну. Першае свята было арганізавана па праекце «Радомля: актыўнасць для адраджэння». Праект фінансаваўся Еўрапейскім саюзам і Інстытутам міжнароднага супрацоўніцтва Нямецкай асацыяцыі народных універсітэтаў (DVV International) са сродкаў Федэральнага міністэрства эканамічнага супрацоўніцтва і развіцця. Праект накіраваны на ўцягванне мясцовых жыхароў у развіццё прыроднага, культурнага і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гістарычнага патэнцыялу тэрыторыі па сродкам арганізацыі мясцовага свята і стварэння турыстычнага маршруту. Падчас падрыхтоўкі праекта былі задзейнічаны эксперты ў вобласці археалогіі і гістарычных навук. На свяце традыцыйна праходзіць стылізаваны кірмаш з вырабамі майстроў і рамеснікаў, праводзяцца майстар-класы па ганчарстве, ткацтву, кавальскай справе. Цэнтральнай падзеяй свята адбываецца тэатралізаваная праграма з прэзентацыяй побыту радзімічаў IX стагоддзя, песнямі, карагодамі, здабычай жывога агню і адроджаным абрадам «Турыхі». У свяце бяруць удзел этнаграфічныя калектывы раённых цэнтралізаваных клубных сістэм. Яны дэманструюць мясцовы рэгіянальны фальклор і майстар-класы па побытавых танцах з прыцягненнем гледачоў.

Падчас абмяркаванння гэтых фестываляў на практычных занятках слухачы нагадваюць і іншыя фальклорныя фестывалі, якія праходзяць у краіне. Падкрэсліваецца, што яны даюць магчымасць творчага самавыяўлення ўсім удзельнікам, і кожны раз становяцца школай перадавога досведу арганізацыі і падтрымкі народнай творчасці.

**И. Б. Стрелкова,**
*кандидат педагогических наук, доцент,*
*доцент кафедры менеджмента*
*и образовательных технологий*
*Института повышения квалификации*
*и переподготовки БГПУ им. М. Танка*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ПРОФЕССИОНАЛЬНЫЕ МЕЖДУНАРОДНЫЕ СТАЖИРОВКИ ПРОФЕССОРСКО-ПРЕПОДАВАТЕЛЬСКОГО СОСТАВА КАК УСЛОВИЕ СОВЕРШЕНСТВОВАНИЯ СИСТЕМЫ ДОПОЛНИТЕЛЬНОГО ПРОФЕССИОНАЛЬНОГО ОБРАЗОВАНИЯ ВЗРОСЛЫХ БЕЛАРУСИ

Международное профессиональное сотрудничество и академическая мобильность стали нормой еще несколько веков назад. Вместе с тем белорусское научное и профессиональное педагогическое сообщество только в последние годы постепенно преодолевают сдерживающие факторы интернациона-